ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
8
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 13 (1351)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА




## РЭСПУБЛІКАНСКАЯ АЛІМПІЯДА

школьнікаў 8—10-х класаў праведзена на базе фізічнага факультэта БДУ. На працягу ўжо некалькіх гадоў у арганізацыі эксперыментальнага і тэарэтычнага тураў такіх алімпіяд актыўны ўдзел прымаюць У. А. Чудакоў, дацэнт кафедры ядзернай фізікі, С. І. Галко, старшы выкладчык кафедры агульнай фізікі, Г. І. Пятровіч, старшы выкладчык кафедры тэарэтычнай фізікі, А. М. Саладухін, асістэнт гэтай жа кафедры.

Удзельнікі алімпіяды сустракаліся з вучонымі факультэта, удзельнічалі ў экскурсіі па фізфаку, наведалі музей БДУ.

**Я. УШАКОЎ,**
**намеснік дэкана фізфака.**

## ЧАРГОВЫ АДКРЫТЫ АГЛЯД

кніг на тэму «Ахова прыроды —доўг і абавязак кожнага з нас» быў падрыхтаваны абанементам навуковай і мастацкай літаратуры універсітэцкай бібліятэкі. У раздзелах «Прырода — усенародны здабытак», «Тэма прыроды ў мастацкай літаратуры», «Датычыць усіх і кожнага» было прадстаўлена больш за 300 выданняў.

**Л. ПЯСТКОЎСКАЯ,**
**старшы бібліятэкар.**

## ВЫЯВІЦЬ ТАЛЕНТЫ

сярод першакурснікаў механіка-матэматычнага факультэта ў дні падрыхтоўкі да традыцыйных «Дзён мехмата» дапамагла сустрэча сярод каманд КВЗ 9—10 і 11—12 груп студэнтаў 1 курса, якая з вялікім поспехам праходзіла ў актавай зале інтэрната № 7.

**Н. ДУБОВІК,**
**студэнтка 1-га курса мехмата.**

## У СПАРТЫЎНАЙ ЗАЛЕ

галоўнага корпуса БДУ праходзіла першынство аблсавета ДСТ «Буравеснік» па мастацкай гімнастыцы. Другое месца ў камандным заліку — у нашай каманды. Трэцяе месца ў асабістым першынстве заняла Алена Падкапаева.

**І. БІЛЕЙЧЫК,**
**студэнтка журфака.**

## ЗВАННЕ ЧЭМПІЁНА БССР

па барацьбе дзю-до ў сярэдняй вагавой катэгорыі (да 86 кг) на першынстве Беларускай ССР, якое праходзіла ў г. Гродна, заваяваў студэнт юрфака Валянцін Матарас. Уладзімір Дуднік (юрфак) упершыню выканаў нарматыў майстра спорту СССР і заняў трэцяе месца ў вазе да 65 кг.

**М. БРЫТКОЎ,**
**трэнер.**

# ПРАЦАВАЦЬ ЯШЧЭ БОЛЬШ ПЛЁННА, ТВОРЧА

НЯДАЎНА адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны ўручэнню Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту імя У. І. Леніна пераходнага Чырвонага сцяга Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1981 год.

На сход сабраліся выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты — прадстаўнікі шматтысячнай універсітэцкай сям'і. Сярод прысутных пануе прыўзняты настрой—гэта іх нястомнымі пошукамі здабыта перамога.

Сход адкрыў сакратар парткома універсітэта дацэнт М. Г. Елісееў. Ён прадаставіў слова намесніку міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР прафесару Мікалаю Сяргеевічу Ягораву:

— Таварышы! Мне выпаў вялікі гонар уручыць вам пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў, якога вы ўдастоены за поспехі ў сацыялістычным спаборніцтве за 1981 год.

Сустрэча з калектывам выкладчыкаў, студэнтаў, аспірантаў і супрацоўнікаў БДУ імя У. І. Леніна, адной з перадавых вучэбных і навуковых устаноў краіны, выклікае шчырую радасць. Узнагароджанне універсітэта Чырвоным сцягам — з'ява значная ў жыцці рэспублікі і краіны.

Перамога Кастрычніка і ўтварэнне СССР адкрылі ўсе магчымасці для развіцця вышэйшай школы і навукі. На світанку Савецкай улады ў Беларусі адкрыўся універсітэт. У рэспубліцы паявілася вышэйшая навучальная ўстанова. БДУ служыць яркім прыкладам клопатаў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб павышэнні ўзроўню адукацыі нашых грамадзян.

Поспех універсітэта звязаны з мэтанакіраванай і творчай працай рэктарата, партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый.

Усесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва ў 1981 годзе стала магутным рычагом павышэння эфектыўнасці і якасці работы ўсіх навучальных устаноў краіны. За мінулы год праведзена значная работа па павышэнню кваліфікацыі выкладчыкаў. Трэба сказаць, што універсітэт паспяхова дапамагае ў гэтай справе іншым ВНУ рэспублікі. З кожным годам расшыраюцца сувязі універсітэта з вытворчасцю. Студэнты маюць магчымасць на практыцы прымяняць і замацоўваць набытыя імі ў аўдыторыях веды.

Я выказваю ўпэўненасць у новых дасягненнях Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Дазвольце павіншаваць вас з ганаровай узнагародай і ўручыць пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў.

Пад дружныя апладысменты прысутных М. С. Ягораў уручае пераходны Чырвоны сцяг.

Слова атрымлівае рэктар універсітэта, акадэмік АН БССР У. А. Белы:

— Дазвольце мне ў гэты ўрачысты час — час уручэння нам пераходнага Чырвонага сцяга Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў — ад імя шматтысячнага калектыву БДУ імя У. І. Леніна першыя словы падзякі выказаць нашай Камуністычнай партыі, якая заўсёды праяўляла і праяўляе вялікую ўвагу і клопат аб развіцці вышэйшай адукацыі ў краіне.

Мы вельмі рады, што гэты сцяг атрымліваем па выніках сацспаборніцтва ў першым годзе пасля XXVI з'езда КПСС, у год 60-годдзя універсітэта, калі былі ўзяты павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы. Вельмі рады, што сцяг мы атрымліваем трэці раз запар.

Універсітэт на працягу 60 гадоў рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў. Працэс іх падрыхтоўкі складаны. Ён пачынаецца з прафесійнай арыентацыі паступаючых і заканчваецца дзяржаўнымі экзаменамі. Нашы выпускнікі становяцца ўсё больш падрыхтаванымі. Яны творча падыходзяць да працы, глыбока асэнсоўваюць задачы, якія стаяць перад імі.

З кожным годам павышаецца аўтарытэт БДУ імя У. І. Леніна. На ВДНГ БССР, у нашым музеі ёсць шмат экспанатаў, якія расказваюць аб дасягненнях універсітэта.

Як ужо гаварылася, адна з асноўных нашых задач — падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Мы павінны за-

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**



# САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

**ПАСПЯХОВА АБАРАНІЛІ КАНДЫДАЦКІЯ ДЫСЕРТАЦЫІ Ў САКАВІКУ:**

**ВІТАЛІЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ СТРУСЕВІЧ** — факультэт прыкладной матэматыкі, навуковы кіраўнік дацэнт **М. А. Лепяшынскі;**

**АЛЯКСАНДР ІВАНАВІЧ ШЧЭРБАНЬ** — біялагічны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **А. Ц. Пікулёў;**

**АЛЕНА ВАСІЛЬЕЎНА КАРАСЁВА** — філалагічны факультэт, навуковы кіраўнік старшы навуковы супрацоўнік **В. А. Каваленка;**

**ЛЮБОЎ ІОСІФАЎНА СОБАЛЕВА** — філалагічны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **А. Я. Супрун;**

**ЛЮДМІЛА УЛАДЗІМІРАЎНА ХВЯДЧЭНЯ** — кафедра англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, навуковы кіраўнік дацэнт **А. П. Кліменка;**

**МІХАІЛ УЛАДЗІМІРАВІЧ НІКАНОВІЧ** — НДІ ПФП, навуковы кіраўнік прафесар **Д. С. Умрэйка;**

**АНАТОЛІЙ ПЯТРОВІЧ ГРЫНЧУК** — НДІ ПФП, навуковы кіраўнік дацэнт **М. А. Вількоцкі;**

**ЛЕАНІД МІКАЛАЕВІЧ ДАНІЛЕЎСКІ** — НДІ ПФП, навуковы кіраўнік прафесар **У. У. Ізох;**

**АЛЕГ УЛАДЗІМІРАВІЧ АЧАСАЎ** — фізічны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **Р. І. САЛАУХІН;**

**ХОРХЕ ЛУІС АРОГА ПЕРЭС**— факультэт прыкладной матэматыкі, навуковы кіраўнік дацэнт **С. У. Новікаў;**

**ІГАР ІВАНАВІЧ АБРАМАЎ** — факультэт радыёфізікі і электронікі, навуковы кіраўнік дацэнт **С. Р. Мулярчык.**

**Жадаем далейшых творчых поспехаў!**

# ПРАЦАВАЦЬ ЯШЧЭ БОЛЬШ ПЛЁННА, ТВОРЧА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

бяспечваць імі не толькі сябе, але і ВНУ рэспублікі. Нашы аспіранты і выкладчыкі маюць усе падставы для яе рашэння. З кожным днём павышаецца кваліфікацыя выкладчыкаў. Толькі за 1981 год ва універсітэце абаронена звыш 100 кандыдацкіх дысертацый. Такі тэмп узяты і на сённяшні дзень. Толькі ў лютым абаронена ўжо 3 доктарскія дысертацыі. Гэта добры задзел для працы ў будучым.

За мінулы год мы палепшылі ўмовы жыцця нашых студэнтаў, супрацоўнікаў, выкладчыкаў.

Ва ўсіх аспектах нашай работы ёсць пэўныя поспехі. Але, як гаварыў Мікалай Сяргеевіч Ягораў, узнагарода нас не толькі радуе і натхняе. Яна нас і абавязвае.

Задач у нас шмат. І ўсе яны накіраваны на выкананне рашэнняў XXVI з'езда КПСС, на дастойную сустрэчу 60-годдзя ўтварэння СССР.

Мы павінны развіваць матэрыяльную базу універсітэта. Трэба рыхтаваць нашых выхаванцаў так, каб кожны з іх стаў чалавекам, які добра валодае асновамі марксісцка-ленінскага вучэння, мае шырокую навуковую і практычную падрыхтоўку, дасканала валодае сваёй спецыяльнасцю. Сённяшні студэнт павінен быць чалавекам высокай культуры, шырокай эрудыцыі.

Дазвольце падзякаваць Міністэрству вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў за такую высокую ацэнку нашай працы.

Мы запэўніваем Цэнтральны Камітэт нашай партыі, што прыкладзём усе свае сілы і веды для таго, каб памножыць дасягнутыя вынікі ў юбілейным для ўсёй краіны годзе, годзе 60-годдзя ўтварэння СССР.

Мы выказваем цвёрдую ўпэўненасць, што калектыў універсітэта, натхнёны высокай ацэнкай яго працы — прысуджэннем пераходнага Чырвонага сцяга, — і далей з гонарам будзе апраўдваць званне флагмана вышэйшай школы Беларускай рэспублікі, займаць дастойнае месца ў сузор'і ВНУ і навуковых цэнтраў нашай Радзімы, уносіць важкі ўклад у вялікую справу камуністычнага будаўніцтва.

На трыбуне міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР прафесар М. М. Мяшкоў:

— Быць у ліку перадавых — вялікі гонар. Вы па праву можаце ганарыцца сваімі поспехамі. І асабліва прыемна, што ўзнагарода ўручана калектыву, які носіць імя У. І. Леніна.

Ва універсітэце многа слаўных традыцый. Выкладчыкі і студэнты памнажаюць свае дасягненні. За ўсім гэтым стаіць напружаная творчая праца.

З кожным годам перад нашай краінай паўстаюць новыя, больш складаныя задачы. Для дасягнення высокіх вынікаў ва універсітэце ёсць усё неабходнае.

М. М. Мяшкоў павіншаваў шматтысячны калектыў універсітэта з узнагародай і выказаў упэўненасць, што і ў бягучым годзе БДУ імя У. І. Леніна будзе ў ліку першых.

Дырэктар НДІ ФХП, член-карэспандэнт АН БССР В. В. Свірыдаў адзначыў, што свой уклад у плённую працу універсітэта ўносіць і навукова-даследчы інстытут:

— Але мы не павінны жыць сённяшнім днём, — сказаў ён. —Мы павінны наладжваць больш цесныя сувязі на прадпрыемствах. Важна, каб усюды працавалі вопытныя, добра падрыхтаваныя людзі. Рашаючы своечасова і якасна ўсе задачы, якія паўстаюць, мы даб'ёмся яшчэ большага.

Заслужаны работнік вышэйшай школы, загадчыца кафедры беларускай літаратуры В. В. Казлова, гаворачы аб поспехах філалагічнага факультэта, сказала, што калектывам выдадзена 7 манаграфій, 12 падручнікаў, 11 вучэбных дапаможнікаў.

— Толькі разам можна вырашыць усе задачы, — падкрэсліла яна.—Патрэбна расшырыць сувязі паміж факультэтамі. Так, да нас звярнуўся дэкан механіка-матэматычнага факультэта з просьбай прачытаць спецкурс па беларускай літаратуры. Доктар філалагічных навук, прафесар А. А. Лойка цяпер чытае там лекцыі. Цесныя сувязі ў нас і з іншымі факультэтамі. Мы абменьваемся вопытам, узбагачаем адзін аднаго.

Праформ кафедры фізфака М. І. Тарасік спынілася на арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва на фізічным факультэце:

— Патрэбна, каб спаборніцтва стала масавым і сапраўды дзейсным. Карані нашых поспехаў знаходзяцца ў ім. Кожны выкладчык ці супрацоўнік, студэнт нясе асабістую адказнасць за сацыялістычныя абавязацельствы, за працу ўсяго калектыву.

Гэтую ж думку падтрымаў сакратар партыйнага бюро гістарычнага факультэта У. Ф. Беркаў.

Ад імя студэнтаў універсітэта выступіла студэнтка механіка-матэматычнага факультэта Э. Дзенісюк:

— У сённяшняй узнагародзе ёсць доля і нашай студэнцкай працы. Студэнтам БДУ імя У. І. Леніна ёсць чым ганарыцца. Больш як 900 чалавек узнагароджаны значком ЦК ВЛКСМ «За выдатную вучобу». Усе групы разгарнулі рух «Ніводнага адстаючага побач!».

Але мы не толькі авалодваем ведамі. На БАМе, у Якуціі, Карэліі, Малдавіі, па ўсёй Беларусі ведаюць нашых будатрадаўцаў. З Магілёўскай і Мінскай абласцей, дзе працуюць універсітэцкія ССГА, прыходзіць нямала падзяк.

Усе выступаючыя запэўнілі, што ў далейшым шматтысячны калектыў БДУ імя У. І. Леніна даб'ецца новых поспехаў.

У заключэнне ўрачыстага сходу адбыўся святочны канцэрт мастацкіх калектываў універсітэта.

У. АБРАМОВІЧ.
В. ШАЧАК (фота).







**Галіновая навукова-даследчая лабараторыя тэрмадынамікі нафтахімічных працэсаў хімічнага факультэта — у ліку лепшых галіновых лабараторый універсітэта. За час існавання з 1976 года эканамічны эфект па закончаных работах склаў 900 тысяч рублёў.**

**НА ЗДЫМКУ: ідзе чарговае даследаванне. Злева направа: загадчык лабараторыі дацэнт Анатоль Дзмітрыевіч Лешчанка, інжынер Уладзімір Міхайлавіч Альхімовіч і кандыдат хімічных навук старшы навуковы супрацоўнік Анатоль Іванавіч Сачак.**

**Фота В. ШАЧАКА.**

**● РАСКАЖУ ПРА ТАВАРЫША**

# КЛІЧА МАРА

КАЛІ ў студэнцкім сельскагаспадарчым атрадзе імя Героя Савецкага Саюза У. Амельянюка, што працаваў у гэтым навучальным годзе ў Клімавіцкім раёне, заходзіла размова аб перадавіках, камандзір атрада заўсёды называў брыгаду Аляксандра Халімончыкава.

З такім вывадам нельга было не згадзіцца. Працоўныя поспехі брыгады гаварылі самі за сябе. Хлопцы працавалі на зернетаку калгаса «Серп і Молат», займаліся сартаваннем канюшыны, збожжа. Зменную норму выконвалі на 120—130 працэнтаў. Стараннем вызначаўся кожны член брыгады, але наперадзе заўсёды быў брыгадзір — Аляксандр Халімончыкаў.

Біяграфія гэтага хлопца не вызначаецца, напэўна, нічым незвычайным. Паспяхова скончыўшы школу, Аляксандр марыць паступіць на факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна. Шчыра палюбіў ён газетнае слова, цікавіўся працай журналіста. Але, мабыць, канчатковы выбар яму дапамог зрабіць старэйшы брат Міхаіл, які скончыў факультэт журналістыкі. Расказы брата аб студэнцкім жыцці, цяжкай, але пачэснай працы журналіста глыбока запалі ў душу Аляксандра. Але атрымалася так, што ажыццяўленне свайго намеру хлопец павінен быў адкласці на два гады.

...Цяжкі першы пад'ём, хваляванне ў час прыняцця прысягі, начныя трывогі — ўсё гэта ўмясцілася ў наступныя два гады. Камандаванне вайсковай часці заўважыла стараннасць і кемлівасць маладога воіна. Ён не раз атрымліваў падзякі. Закончыў службу ў званні старшыны.

Аляксандр вярнуўся ў родную вёску, але з запаветнай марай так і не развітаўся. Яшчэ ў час службы актыўна супрацоўнічаў у газеце. Маючы ўжо некаторы вопыт, зноў паспрабаваў паступіць на факультэт журналістыкі. І зноў спроба аказалася беспаспяховай: не прайшоў па конкурсу. Але юнак не адчайваецца. У тым жа годзе ён паступае на падрыхтоўчае аддзяленне.

...Толькі ва ўспамінах ды на фотаздымках засталіся і першая «бульба», і першая сесія. Кожны ўжо ведае, хто ёсць хто. Ведаюць на факультэце і Аляксандра Халімончыкава, камсорга курса, як добрага і шчырага сябра, камсамольскага актывіста.

Не за гарамі працоўны семестр. Тры будатрады сфарміраваны на факультэце журналістыкі. Адзін з іх, той, што накіроўваецца ў Віцебскую вобласць, узначаліць Аляксандр Халімончыкаў.

І. ГАНЧАРУК.

● ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# ДАЙСЦІ ДА КОЖНАГА

ПАРТГРУПА кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання факультэта журналістыкі сабралася на сваё чарговае пасяджэнне. На парадку дня пытанне аб выніках работы партгрупы па ідэйна-палітычнаму выхаванню і прафесійнай падрыхтоўцы будучых журналістаў.

З вялікай увагай і адказнасцю рыхтаваліся да гэтага пасяджэння камуністы кафедры. Было вырашана запрасіць да ўдзелу ў гутарцы куратараў, усіх супрацоўнікаў кафедры з тым, каб абмеркаваць увесь комплекс надзённых пытанняў вучэбна - выхаваўчай работы.

І вось пасяджэнне пачалося. Адзін за адным выступаюць прамоўцы. Слова атрымлівае камуніст М. Р. Каваленка. Увагу прысутных ён засярodзіў на мерапрыемствах палітыка-выхаваўчага характару, якія праводзяцца партгрупай на кафедры, а таксама куратарамі і выкладчыкамі кафедры сярод студэнтаў факультэта ў вучэбны і вольны ад заняткаў час. Як куратар акадэмічнай групы, Мікалай Рыгоравіч падзяліўся сваім уласным вопытам арганізацыйна-выхаваўчай работы, назваў найбольш важныя мерапрыемствы, якія праводзяцца ў групе, намеціў планы на будучае. Разам з тым ён зрабіў шэраг крытычных заўваг адносна форм і метадаў работы куратараў у групах і ў інтэрнаце, унёс канкрэтныя прапановы па паляпшэнню вучэбна - выхаваўчай работы сярод студэнтаў.

Пра стан прафесійнай падрыхтоўкі і ідэйнага выхавання замежных студэнтаў, якія навучаюцца на факультэце, гаварыла загадчыца аддзялення па рабоце з замежнымі студэнтамі член партгрупы А. А. Рудэнка:

— Сваю работу на аддзяленні мы імкнёмся будаваць такім чынам, каб навучальна-прафесійная падрыхтоўка студэнтаў непарыўна звязвалася з ідэйна-палітычным выхаваннем. Намі распрацаваны падрабязныя планы палітыка-выхаваўчай, азнаямленчай і індывідуальнай шэфскай работы, а таксама планы культурна-масавых мерапрыемстваў. Па свайму зместу яны даволі разнастайныя. Гэта і штотыднёвыя палітінфармацыі ў групах, і сустрэчы са знатнымі людзьмі краіны, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, перадавікамі вытворчасці, пісьменнікамі, журналістамі, работнікамі мастацтва, культуры, і калектыўныя паходы ў музеі, тэатры, кіно, і паездкі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкіх людзей.

У абмеркаванні ўзнятага пытання актыўны ўдзел прынялі куратары студэнцкіх груп. Усе яны зацікаўлена гаварылі аб праведзеных мерапрыемствах, абменьваліся думкамі і вопытам сваёй работы.

Прымаюцца канкрэтныя рашэнні, прапановы. Члены партгрупы сыходзяцца на думцы аб тым, што ў мэтах узмацнення ідэйна-выхаваўчай работы і паляпшэння вучэбнай падрыхтоўкі студэнтаў партгрупе кафедры неабходна шырэй разгортваць сацыялістычнае спаборніцтва паміж акадэмічнымі групамі і асобнымі курсамі, а таксама выкладчыкамі кафедры, разнастаіць формы і метады палітычнай прапаганды і агітацыі, дабіваючыся пры гэтым найбольшай іх эфектыўнасці і дзейснасці. Камуністам, усім выкладчыкам кафедры — павышаць навукова-ідэйны і метадычны ўзровень лекцый, практычных і семінарскіх заняткаў, пастаянна праяўляць клопат аб ідэалагічнай падрыхтоўцы і прафесійным майстэрстве маладых спецыялістаў.

...А неўзабаве работа партгрупы кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання па вучэбнай і ідэйна-палітычнай рабоце была заслухана на пасяджэнні партыйнага бюро факультэта. З увагай выслухана справаздача. Шмат, як заўсёды, пытанняў у членаў партыйнага бюро, дэкана факультэта П. І. Ткачова. І ў кожным з іх — клопат і зацікаўленасць у павышэнні ўзроўню і эфектыўнасці палітыка-выхаваўчай работы на кафедры, факультэце, у кожнай асобнай студэнцкай групе. Патрабавальна, прынцыпова абмеркаваны пытанні. Зроблены заўвагі, выказаны пажаданні і прапановы па далейшаму паляпшэнню вучэбна-выхаваўчай работы на кафедры і факультэце ў цэлым.

Партгрупа кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, як і іншых кафедр факультэта, поўная рашучасці будаваць сваю работу такім чынам, каб наказы камуністаў атрымалі сваё выражэнне ў канкрэтных справах.

**А. НАРКЕВІЧ,**
**партгрупорг кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, прафесар.**



**С. К. Рахманаў — намеснік старшыні савета маладых вучоных універсітэта, кандыдат хімічных навук, загадчык лабараторыі. Малады вучоны не толькі сам актыўна займаецца навуковай работай, а прыцягвае да яе і студэнтаў.**
**Фота В. ШАЧАКА.**

● АГЛЯД ДРУКУ

# СВЕДКА СПРАЎ ФАКУЛЬТЭЦКІХ

НЕЗДАРМА лічаць, што насценная газета — твар факультэта. Прачытаеш — акунешся ў яго жыццё. Тут адлюстраваны поспехі калектыву, планы, задачы.

Давайце бліжэй пазнаёмімся з насценкамі фізфака, мехмата і ФПМ. Усе апошнія нумары іх прысвечаны Міжнароднаму жаночаму дню. І хаця пасля свята прайшлі ўжо тыдні, студэнты зацікаўлена ўглядаюцца ў рознакаляровыя аркушы. На ФПМ і фізфаку газеты вісяць на скрыжаванні калідораў. Каля іх заўсёды людна. І толькі на мехмаце я сустрэў усяго двух чалавек ля стэнда з газетай, ды і то сюды, у канец калідора, яны трапілі выпадкова. Насценгазета на гэтым факультэце знаходзіцца ў не вельмі зручным месцы.

Першае, што кідаецца ў вочы — нумарацыя. На фізфакаўскай насценгазеце «За навуку» стаяў № 210, а на «Алгарытме» (ФПМ) № 111. Вялікія лічбы, і немагчыма вызначыць перыядычнасць выхаду. Чаму б не ставіць парадкавы нумар у цяперашнім навучальным годзе, а ў дужках — агульны?

Толькі на мехматаўскай газеце «Рошым любую задачу» (скарочана «РЛЗ») стаяла сціплая лічба 5. Але калі я папрасіў у камітэце камсамола паказаць мне папярэднія нумары, то знайшоўся толькі адзін — пераднавагодні. Члены камітэта камсамола не маглі ўспомніць, ці выпускалася яшчэ адна газета. Пасля гэты ж нумар я ўбачыў на вечары сустрэчы з першацалінным атрадам, куды універсітэцкія СБА прадставілі свае насценкі. Дзіўныя блуканні...

«За навуку» (фізфак) выходзіць раз у месяц і ў асноўным перад святочнымі днямі. На ФПМ сказалі, што насценгазета «Алгарытм» абавязкова абнаўляецца адзін раз у месяц, бывае, што і два.

Вельмі цяжка аналізаваць матэрыялы, змешчаныя ў святочных нумарах. Як-ніяк, але свята накладвае сваю пячатку. Нямнога можна ўгледзець крытычных сігналаў. У асноўным— віншаванні. І амаль няма сур'ёзнай, прынцыповай размовы аб штодзённых справах, аб факультэцкіх праблемах.

Вылучаецца «За навуку». На фізфаку ёй удзяляюць шмат увагі. Дарэчы, студэнты складаюць менш палавіны саставу рэдкалегіі. Астатняя частка — супрацоўнікі. На ФПМ і мехмаце выпускам насценгазеты займаюцца толькі студэнты.

«За навуку» вызначаецца яшчэ і тым, што ў ёй шырока прадстаўлена партыйная тэматыка. Напрыклад, у апошнім нумары намеснік сакратара партбюро фізфака па ідэалагічнай рабоце В. Кулажанка вядзе размову аб адкрытым партыйным сходзе. У кожным нумары пад рубрыкай «Партыйнае жыццё» змяшчаюцца выступленні членаў партбюро факультэта...

А ці часта мы сустракаем такія матэрыялы ў іншых насценгазетах? Не. Але ж газета факультэта — гэта не толькі орган камітэта камсамола і прафбюро, але і орган партыйнага бюро. І калі камуністы будуць ўдзельнічаць у жыцці газеты, то і роля яе на факультэце значна ўзрасце.

Калі гаварыць аб сур'ёзнасці тэм, то ў першую чаргу зноў трэба выдзеліць «За навуку». Тут можна прачытаць аб праблемах вячэрняй адукацыі, аб выкананні дагаворных работ студэнтамі фізфака і г. д.

Узнімаюцца факультэцкія праблемы і газетай мехмата. У «РЛЗ» змешчаны, напрыклад, перадавы артыкул «Навука. Творчасць. Студэнт», у якім размова вядзецца аб магчымасці ўдзелу студэнтаў у навуковых распрацоўках.

Што ж датычыць «Алгарытма», то тут публікацый, дзе ўзнімаюцца надзённыя пытанні, — нямнога.

Ва ўсіх газетах паведамляецца аб выніках першага семестра. Гэтыя матэрыялы амаль падобныя. Лічбы — дыяграмы, дыяграмы — лічбы. Кожнаму ясна, што паспяховасць павінна быць добрай. Дык давайце паразважаем, што неабходна зрабіць на факультэце для яе павышэння? Чаму б не даць слова выкладчыку і студэнту? Якімі б красамоўнымі ні былі лічбы самі па сабе, яны задачу не вырашаць.

Толькі «За навуку» можа пахваліцца матэрыяламі аб студэнцкіх групах. І яшчэ тут уведзена цікавая рубрыка «Прадстаўляем кафедру», дзе змяшчаюцца матэрыялы, якія знаёмяць непасрэдна з падраздзяленнямі факультэта.

У кожнай насценгазеце ёсць месца для гумару. На жаль, там змешчаны, як правіла, перапісаныя гумарэскі з цэнтральных газет і часопісаў.

І апошняя заўвага — на многіх нумарах газет не стаяць прозвішчы рэдактара і тых, хто працаваў над выпускам (асабліва ў «РЛЗ»). У газеце «За навуку» прозвішча рэдактара любяць ставіць у канцы сярэдняга ліста, а трэба — у самым канцы газеты. Рэдактар адказвае за кожнае слова.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**

● СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС

# ЗАПАЛІЦЬ ПЕСНЯЙ ДУШУ...

АПОШНІ акорд гітары, і песня скончылася. Некалькі імгненняў пануе цішыня, і раптам зала ўзрываецца апладысментамі. Спявачка з чырвонымі ружамі ў руках адыходзіць на сярэдзіну сцэны.

Імя яе вядома ўсім, хто па-сапраўднаму разумее і любіць народную песню. З яе канцэрта абыякавым пайсці немагчыма, бо кожная песня — гэта споведзь перад слухачом. Выдатнае валоданне акустычнай гітарай і тэмбравым дыяпазонам голасу дае магчымасць выканаўцы найбольш эфектна і рэалістычна перадаць змест і настрой песні.

Вось ужо адзінаццаць гадоў імя Жанны Бічэўскай не сыходзіць з канцэртных афіш. Спявачка пабывала на гастролях у сарака краінах свету. А на мінулым тыдні Ж. Бічэўская была госцяй студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна.

Пасля заканчэння ў 1966 годзе сярэдняй школы Жанна паступіла ў музычную школу па класу гітары, дзе яе педагогам быў вядомы савецкі гітарыст Іваноў-Крамскі. Потым яна стала студэнткай вучылішча эстрадна-цыркавога мастацтва.

— Думала, што давядзецца стаць клоунам, — усміхаецца Жанна,—бо ў вучылішчы мы асвойвалі не толькі тэорыю мастацтваў, песні, танцы, але і клаунаду.

У 1971 годзе Ж. Бічэўская скончыла вучылішча, і лёс падарыў ёй сустрэчы з цудоўнымі людзьмі: паэтам Булатам Акуджавай і спявачкай Лідзіяй Русланавай.

— Булат Шаўлавіч, — успамінае Жанна,—найграў мне неяк на гітары рускую народную песню «Матушка» і сказаў, што гэтая песня павінна стаць толькі маёй. Я з чыстым сэрцам называю цяпер Б. Акуджаву сваім «хросным бацькам». І зусім невыпадкова, што «Матушка» ў некалькі іншай манеры запісана і на маю другую пласцінку.

А вось з Русланавай мне давялося сустрэцца на канцэрце. Лідзія Андрэеўна была тады ўжо хворая, але яшчэ шмат чаго змагла расказаць пра нашу рускую песню...

Ж. Бічэўская вядома і як збіральніца фальклору. На яе думку, толькі праз народны паэтычны эпас можна спазнаць душу свайго народа, яго характар, які складваўся на працягу многіх стагоддзяў. У Саратаўскай вобласці ёю была запісана народная песня канца XVII стагоддзя «Я в садочке была». З асаблівай цеплынёй успамінае Ж. Бічэўская, як у невялікай вёсачцы Някіпелава Маскоўскай вобласці ёй давялося жыць у старой хацінцы з амаль дзевяностагадовымі бабулямі Нюшай і Паўлінай:

— Я разам з імі танцавала, нават вучыла іх іграць на гітары. З вуснаў гэтых бабулек была запісана песня «Как на дальней сторонке».

Дзякуючы таленту Ж. Бічэўскай другое жыццё атрымалі і старадаўні раманс «Шумел камыш», і сібірская народная песня «По диким степям Забайкалья», і «По Дону гуляет казак молодой», і іншыя.

Асаблівае ўздзеянне на творчасць Бічэўскай аказаў беларускі ансамбль «Песняры».

— Ад іх я пачарпнула смелы погляд на адносіны да фальклору, — гаворыць Жанна...

Мы сустрэліся са спявачкай пасля канцэрта. За час невялікай размовы Жанна змагла адказаць на некаторыя пытанні і пакінуць свае пажаданні чытачам газеты.

**І. ПАПКО,**
**Ю. БЯСТВІЦКІ.**

Пойте фольклор!
Любите и храните его!
Ж. Бичевская.

Читателям
«Белорусского университета»
03.04.82

# РУЖОВЫ РАНАК

Літаратурная старонка

**ВАЛЯНЦІН ЖДАНКО**

## РОДНАЯ ВЁСКА

Стан абвіўшы блакітнай стужкай,
У зялёнай хусцінцы квяцістай
Ты імчыш хуткакрылаю птушкай
Удалячынь, на ўсход залацісты.
Я люблю цябе шчыра, душою,
За світанні ў лузе духмяным
І за дуб, што стаіць над гарою,
І за бор з пахам верасу п'яным.

Не магу я забыць твае ночы
З зоркападам у жніўні багатым,
Не магу я забыць твае вочы,
Што і сёння клічуць дахаты.
Я прыду да цябе, я прыду,
Каб пабачыць цябе, каб сустрэць,
Голаў нізка схілю. І паеду
З ціхім жалем, журботай у сэрцы.

**ЮЛІЯ ГУРТОЎЦАВА**

## ЛИВЕНЬ В ГОРОДЕ

Город умывается дождем,
Трет мочалкой-тучей зданий крыши.
Обновленьем в городе моем
Каждый дом и каждый кустик дышит.

Город умывается грозой,
Ливню подставляя мостовые,
Свежесть — это в воздухе озон,
Рябь асфальта — капли дождевые.

Под навесом книжного ларька
Люди прячутся и книги раскрывают,
А по мостовой бежит река —
Новые притоки собирает.

Заблестел асфальт, отмыт до блеска,
Выше вытянулись к небесам
Клены. Капель стук прервавши резко,
Дождь внезапно сразу перестал.

Воздух стал прозрачней. Солнца луч
В радугу дождинки собирает.
Ветер, разбросав остатки туч,
Небо облаками вытирает.

**АЛЕСЬ ЦВЯХ**

*Последняя любовь*
*прекрасней первой.*
*Ігар Шклярэўскі*

Б'юць хвалі людскіх вакханалій.
Натоўпы спяшаюцца жыць.
Блажэнныя! Вы пакахалі,
адрынуўшы хіжасць ханжы.

Шчаслівыя! Як вам адужаць
шыпенне шматлікай радні,
а жыць з абыякавым мужам—
стагоддзямі цягнуцца дні.

Нішто не пашкодзіць шчасцю.
І плёткі, і плаха—прэч!..
Сустрэча дабра са страсцю—
найвелічная з сустрэч.

Па-над лабірынтамі вулак
асветліцца боль пачуцця.
І стане адзін пацалунак
адзінай патрэбай жыцця.

Нябёсамі блаславёны
спрадвечны, як свет, саюз.
І чыстыя вашы імёны,
як вёсны над смерцю і тлёнам,—
узносяцца музыкай муз.

**ЛІЛІЯ МАТУСЕВІЧ**

## НА РАДЗІМЕ

Край, Беларусь! Да воблакаў дрэвы.
П'яні, лясны, духмяны пах!
Я поля, лесу каралева,
І мне даступны кожны гмах.

З жытнёвых каласоў карона,
Бо косіць сын іх, хлебароб.
Я воляй поля адарона.
О, блаславён жыцця парог!

Вунь статак на зялёнай ніве,
Ружовы лета небасхіл,
А думак, як азёр разлівы,
Пра нашы светлыя шляхі.

Люблю прачнуцца разам з сонцам,
Дзе мудрацы будуюць дом.
Радок ткаць з промняў-валаконцаў,
Каб дабрыню сыпнуць на дол.

Мой гмах жыцця стаіць на выспе,
Дзе бульбяны, сасновы край.
Пад польку смеху звон срабрысты.
Я каралева. Тут мой рай!

## У МАЛАДОСЦІ

Прыгляджуся к бярозцы вясенняй,
Што салатавым лісцем дыміць —
Аж ліецца у сэрца вяселле,
І расстанне зусім не баліць.

Покуль я цвіту цветам, як дрэва,
І пяшчоту у сэрцы нашу,
І пачуцці растуць, як пасевы,
Я равесніка абваражу.

Я надзену зялёнае плацце.
У пралесках вясенняй любві
Будуць вочкі мае разгарацца,
Дапушчу маю шыйку абвіць.

Будзем нашай сустрэчы мы рады,
Пах бярозавы будзе хмяліць,
І размова ўся пойдзе да ладу,
Сэрца весняй вадою бурліць.

**УЛАДЗІМІР СЯМЕНЧЫК**

* * *

Пройдет и это отреченье!
От глубины — за красоту.
Но красота — лишь увлеченье.
Понятно легкое волненье
при виде броского растенья в цвету.
Но догадаться невозможно,
что истинно, а что в нем ложно,
не наклонившись свысока
и не вдыхая осторожно
глубинный аромат цветка.

## СТИХИ О ВСТРЕЧНОМ

Я опять не пойму, конечно,
в час заката недолговечный,
мне навстречу шагает Встречный,
постоянный и бесконечный,
неизменный мой вечный Встречный,
и хрустит под шагами снег.
Я опять не пойму ,конечно,
он какой — этот вечный Встречный,
добрый или бесчеловечный,
лживый или чистосердечный,
пресерьезный или беспечный,—
в общем, что он за человек?
Мы проходим мимо друг друга.
Не слыхать из груди ни звука.
Но за внешностью безразличной
нашей встречи тайная суть:
Мы следим друг за другом украдкой,
я — загадка и он — загадка.
И наш путь, простой и обычный,
превращается в Млечный путь.



**СЯРГЕЙ МЕЛЬНІКАЎ**

* * *

Напрасно быстрая река,
Пригнув чешуйчатую спину,
На крупе горного хребта
Догнать пытается равнину.

Все остается на местах,
И в то же время все другое,
И ягод серьги на кустах,
И небо ясно-голубое.
Неутомима жизни стать,
Свисая с кручи корнем бука,
Совсем не силится роптать,
Что с твердой почвою в разлуке.
Так нам покажется порой:
Мы можем с ходу взять вершину.
Вершина создана горой и утверждается долиной.
Но есть ли смысл стремиться к ней?!
И разве на земле нам тесно?!
В долине нам поет ручей
И льется жаворонка песня.

* * *

Захватывает дух
От первых дней капели.
Пейзажа акварели
Размякли разом вдруг.
Прошел заветный слух:
Ветра сообщить успели,
Что стаи птиц осели
И зеленеет луг.
Движенья твоих рук
Мне кажется, взлетели...
Они преодолели
Отчаянность разлук,
Чтоб все, кто сердцем глух,
Как будто бы прозрели
И странствий захотели,
Любви, лишений, мук.

# Каляндар прыроды

*КРАСАВІК — месяц найбольшых кантрастаў. Снег на палях, на узлесках, на вуліцах горада ужо растаў. Зямля распаўсюджвае цёплы, духмяны пар. Аднак у глухім лесе яшчэ ўладарыць зіма. Схамянулася яна, але ўжо позна.*

*Дрэвы яшчэ не паспелі апрануцца ў сваё дымчата-зялёнае ўбранне, хвалююцца. Нібыта ў чаканні, стаяць яны па калені ў халодным веснавым разліве. «Красавік з вадой — май з травой!» — радуецца хлебароб.*

*Ужо прачнуліся ад здранцвення насякомыя; апоўдні можна ўбачыць першых матылькоў: жоўтыя лімонніцы і прыгожыя крапіўніцы пырхаюць у пошуках першых кветак; абуджаныя жыватворнымі сонечнымі промнямі, раяцца камары; раскрыліся сінія збаночкі сон-травы і блакітныя пралескі. На палянах, лужках, на лясных узлесках раскіданы яркія кружочкі-сонейкі падбелу. Так і хочацца сарваць налітыя золатам яркія суквецці, але шкада становіцца іх. Нахілішся да самай зямлі і толькі ўдыхнеш водар вясны.*

*Ганарыстыя кветкі... Побач яшчэ ляжыць снег, і светлыя ручайкі выцякаюць з-пад яго, а яны квітнеюць, каб радаваць нас і каб праз які-небудзь месяц стаць звычайнымі. На змену ім прыйдуць цюльпаны, нарцысы, ландышы...*

*Звонкае перашэптванне ручайкоў, заліхвацкія галасы птушак, якія ўжо вярнуліся, шум ажываючай прыроды — радасная музыка красавіка: Зусім нядаўна ззяў снег, а зараз яго ўсё менш і менш. Вясна набрала сілу, лес уздыхнуў на ўсю сваю моц.*

*Красавік—месяц у годзе асаблівы: у яго ключы да цяпла — як адкрые, так і будзе.*

**Аляксандр ВАЛОШЫН.**

# ПАЛАЖЭННЕ

### АБ ПРАВЯДЗЕННІ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ АГІТАЦЫЙНА-МАСТАЦКІХ БРЫГАД БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

**Агляд-конкурс агітбрыгад праводзіцца 26 красавіка 1982 года. Мэтай агляду-конкурсу з'яўляецца далейшае умацаванне і развіццё агітбрыгад ва універсітэце, павышэнне ідэйна-мастацкага ўзроўню рэпертуару агітбрыгад і выканаўчага майстэрства, умацаванне сувязей праграм агітбрыгад з праблемамі сучаснасці, умацаванне ролі агітбрыгад у камуністычным выхаванні працоўных.**

**Агляд-конкурс агітбрыгад прысвячаецца 60-годдзю ўтварэння СССР, 100-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа.**

**Журы ацэньвае выступленні кожнай агітбрыгады па наступных паказчыках:**

**1. АКТУАЛЬНАСЦЬ І ГРАМАДСКАЯ ЗНАЧНАСЦЬ ВЫСТУПЛЕННЯ**
**2. ВЫКАНАННЕ ПАТРАБАВАННЯЎ ПАЛАЖЭННЯ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ:**
**3. ВЫКАНАЎЧАЕ МАЙСТЭРСТВА**
**4. МУЗЫЧНАЕ СУПРАВАДЖЭННЕ:**
**5. КАМПАЗІЦЫЙНАЕ РАШЭННЕ ПРАГРАМ**
**6. СЦЭНІЧНАЯ КУЛЬТУРА.**

**Пераможцы вызначаюцца па агульнай суме балаў. Журы мае права заахвочваць агітбрыгады за добрае сцэнічнае рашэнне праграмы (ад 5 да 10 балаў).**

**У аглядзе-конкурсе прымаюць удзел толькі агітбрыгады факультэтаў. Працягласць выступлення 25—30 мінут. Кіраўнікам агітбрыгад прадставіць сцэнарыі выступленняў у студэнцкі клуб універсітэта да 20 красавіка.**

**Агітбрыгады, якія занялі 1—3-я месцы ў аглядзе-конкурсе, узнагароджваюцца Ганаровымі граматамі.**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

8 красавіка 1982 г.

АТ 21203 Заказ 711.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ